№ 62

Сялянская бібліотэка

ТАРАС ГУШЧА

# ВЫБРАНЫЯ АПАВЯДАНЬНІ

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі
Менск
1·9·2·6

В. Д.

№ 62 СЯЛЯНСКАЯ БІБЛІОТЭКА № 62



ТАРАС ГУШЧА 



# ВЫБРАНЫЯ
# АПАВЯДАНЬНІ



ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК—1926

БДВ № 67. Галоўлітбел № 16545.

1-я Дзярж. друк. Заказ № 323. У ліку 3.000 экз.

# ДАЧАКАЎСЯ

## I

Раман Шульдзяк толькі што адпрог каня з плуга і пусьціў яго папасьвіцца ў маладым дубняку над ярам, а сам разьлёгся пад ценем разьвіслага дуба.

Эх, люба ты, часіна сапачынку, пасьля працы! А Раман такі папрацаваў: ужо па полі ходзячы за плугам, спаткаў ён усход сонца. Спачатку работа ня ладзілася— проста ня было ахвоты працаваць, бо яго надзел быў самы горшы. Але як гэты надзел дастаўся яму па жэраб'і, то й ня было на каго наракаць. Ды ўсё-ж такі трэба было спагнаць сваю злосьць хоць на чым ці на кім-небудзь. І праўда, Раман, прводзячы першыя баразны, кіпеў злосьцю на новыя парадкі, а больш за ўсё на гэту «камунію», бо вельмі-ж было крыўдна, што яна лічыла яго кулаком; асабліва гэты басяк, Кандратаў Хведзька, дапякаў яму. Ну хоць-бы чалавек, а то проста лодыр, прагуляў сваю зямлю яшчэ да вайны, а потым пашоў бадзяцца па капальнях, нідзе не затрымаўся, у Сібір пераехаў і там не асеўся, а цяпер, вось, вярнуўся, засеў у панскім доме і крычыць:

«Я—пролетары, а вы—кулакі, забралі ўсё і смокчаце маю кроў!» Падабраў сабе хаўрусьнікаў, зрабіўся прадсядацелем «камітэту беднаты»; сам нічога ня робіць, толькі ходзіць са сваёй кампаніяй па заможных гаспадарох, каб дзе што ўзяць і заткнуць сваё паганае, горла. Нябось, ваяваць за камунію ня хоча йсьці. «Мы, кажа, больш патрэбны тут, у тылу, чым на фронце».

Дадумаўшы свае думкі аб Кандратавым Хведзьку да таго моманту яго жыцьця, калі гэты самы Хведзька папаўся на хабарох і з гэтае самае прычыны быў скінуты з пасады «прадсядацеля» і адданы пад суд, Раман крыху заспакоіўся. Работа памалу ўцягнула яго ў сваю абладу. Ён шпарка хадзіў за плугам і толькі на заваротах выціраў свой мокры лоб, адсоўваючы на патыліцу шапку. І толькі тады, калі сонца ўгрэла, як мае быць, а конь і сам ён парадкам натаміліся, ён выпраг каня, каб пахадзіў па траве, і сам прылёг пад гэтым дубам.

Дзень быў ясны, цёплы.

На полі зачыналі ўжо зацьвітаць грэчкі.

Колькі моманту Раман ляжаў нярухліва, адчуваючы прыемнасьць і асалоду сапачынку, ляжаў, заплюшчыўшы вочы.

Проста не хацелася нават і паварушыцца. Але нярухомасьць цела прышлося ўсё-ж такі парушыць: чуваць было, як ціснулі аборы, уядаючыся ў яго стомленыя, ацёкшыя ад хады ногі. Раман прысеў, каб разуцца.

Павольна, не сьпяшаючыся, разьвязаў ён аборкі, зьняў з ног цяжкія вяровачныя лапці, якія чамусь называліся «керанскімі», вытрас з іх чорныя грудкі зямлі і шпурнуў на сонца прасушыцца. Цяпер было зусім добра, вольна.

Рамана марыў сон. Ён глянуў на каня санлівымі вачамі, як-бы штось разважаючы. Конік весела згрызаў маладую пахучую траўку і громка пырхаў.

— Здароў, малы,—адказаў Раман на гэтае пырханьне і лёг сьпіною на зялёны дзірван, выцягнуўшыся ва ўсю даўжыню свайго здаравецкага цела.

Ён заплюшчыў вочы і ўжо пачынаў драмаць. Як нейкія цені, у галаве яго прасунуліся ўспаміны, вобразы даўно перабытых часоў. Прасунуліся і зьніклі.

— Гу-у-ур-р!

Дзесь далёка, як-бы з-за зямлі да вушэй Рамана данёсься нейкі глухі гром.

— Няўжо ўстае хмара і зьбіраецца дождж?—падумалася Раману.

Паварушыцца і паглядзець на неба яму не хацелася, бо так добра было ляжаць. Ён зноў сьцішыўся, гатовы заснуць.

Гром пракаціўся яшчэ раз і ціха скалыхнуў паветра. Цяпер гэты гук быў многа выразьнейшы. Раман пачуў, што яго нешта як-бы штурханула з сярэдзіны, бо ў голасе гэтага грому пачулася штось новае і страшнае.

Ён прысеў і прыслухаўся. Неба было яснае, спакойнае. Там-сям на небе стаялі камячкі белаватых хмурынак, як адзнакі добрае пагоды. Зрэдка павяваў невялічкі паўднёвы ветрык, ціха калышучы лісьцё дуба. Раман прыслухоўваўся нядоўга: таемны гук грымнуў і ў трэці, і ў чацьверты раз.

Ну, цяпер ясна: гэта грымелі гарматы, і гук іх данасіўся якраз з поўдня.

Сон разьбіўся. Раман сядзеў і слухаў, як грымелі далёкія стрэлы гармат, і ў яго душы падымаліся нейкія хвалі многалучнага пачуцьця і нейкага нявыразнага настрою. Перш за ўсё адчуваўся страх, але разам з тым было і штось прыгожа-павабнае ў гэтым далёкім грукатаньні, і нейкая няясная надзея калыхала сэрца Рамана. Якая гэта была надзея, на што накіроўвалася яна, якая яе была істота—Раман ня мог разабрацца. У яго выабра-

жэньні пачалі выяўляцца малюнкі вайны, ён стараўся вызначыць тое месца, дзе грымелі гарматы, і ўжо пачаў вылічаць, калі да іх ціхага сяла дакоціцца хваля вайны.

А страшныя гукі, так моцна калышучы душу, усё грымелі і грымелі, то караткія, то працяжныя. Яны парушалі звычайную плынь жыцьця Рамана, яны прыносілі новыя пачуцьці і выклікалі цэлы шэраг новых пытаньняў.

Раману хацелася падзяліцца з кім-небудзь сваімі ўражаньнямі, сваімі думкамі.

Ён абвёў вачамі поле. На полі было ціха і пуста, ні душы. Яму здавалася, што поле і гэтыя яры з іх хмызьнякамі і дзікімі грушамі, і гэтыя невялічкія ляскі, раскіданыя сям-там цёмна-сінімі кудзеркамі, таксама мелі цяпер нейкую нязвычайную выразу, як-бы іх засмуціла зусім новае і неспадзяванае пытаньне. Вярсты дзьве, па той бок яру, стаяла іх сяло, а з аднаго і з другога боку—цэлы рад ветракоў з занямелымі крыльлямі. Вецер заспакоіўся, і некаму было вярцець іх крыльлі, хоць у вапошнія часы і пры добрым ветры стаялі яны нярухома, бо ня было чаго малоць.

Раману было маркотна. Ён падняўся, падышоў да коніка. Конь старанна згры-

заў сакаўную траву, аганяючы хвастом надаедную заедзь. Убачыўшы каля сябе гаспадара, ён прыветна падняў галаву, хрумстаючы траву. Раман зьлёгка, з любасьцю патрапаў па шыі коніка і прамовіў:

— Эх, ты, конік, мой конік! Дурны ты, брат! Там гарматы гудуць, а ты нічога не разумееш і вухам не вядзеш. Скаціна ты, скажу табе, неразумная!

Конік шаргануў разоў два галавою аб руку гаспадара ды зноў пачаў скубсьці траву. Раман яшчэ пастаяў трохі каля свайго коніка, пазіраючы на яго, і чагось уздыхнуў, а потым запыніўся за разложыстым арэхавым кустом, дзе гук гарматных стрэлаў адбіваўся яшчэ выразьней.

— І здорава-ж бухаюць,—ціха прамовіў Раман і сам сабе паківаў галавою.

Па сьцежачцы, што вілася напрасткі ад лесу і бегла праз гэтае поле, павольна пасоўваліся якраз сюды дзьве чалавечыя фігуры. Сьцежачка злучала сяло Ліпавец з воласьцю. Да воласьці адгэтуль было ня больш як чатыры вярсты. Заўважыўшы людзей, Раман ажывіўся і значна павесялеў. Там, у воласьці, напэўна дачуліся яны якіх-небудзь навін. Цікава будзе пагаманіць з людзьмі і абсудзіць гэтае новае па-

лажэньне рэчаў, аб якім так грозна загаварылі гарматы, бо толькі такім чынам, шляхам агульна-грамадзкага высьвятленьня пытаньня, складаецца сталая грамадзянская думка. Раман прызіраўся, стараючыся згадаць, хто гэтыя людзі. Аднаго ён ужо пазнаў: то быў недалёкі сусед, сталяр Пятро Мазалеўскі. Праўда, і пазнаць яго было ня трудна, бо ня было другога такога чалавека ва ўсім Ліпаўцы, так бедна адзетага і наогул такога горкага бедака, як гэты сталяр Пятро. Яго аблезлая, круглая шапка даўно ўжо страціла ня толькі свой былы надворны выгляд, але згубіла і самую гісторыю свайго пахаджэньня. Яна нязьменна сядзела на галаве свайго ўладцы, зрабіўшыся як-бы часткаю гэтае галавы. Кароткі кажушок, калісь меўшы белы колер, цяпер быў зямліста-шэры, аблеплены латкамі рознае велічыні, гатунку і формы. Тут былі латкі палатняныя, кажурынкавыя, суконныя, раменныя. Полы кажушка скончваліся пашматованымі, абтрэпанымі лахманамі, якія пры хадзе і пры ветры рабілі вельмі сьмешныя і замыславатыя рухі. І трэба зазначыць, што ва ўсім сяле ня было другога чалавека, такога прыхільніка да новае ўлады, як Пятро. Ня гледзячы на тое, што рэволюцыя падсекла яму крыльлі,

зьнішчыўшы яго грошы, якія зарабіў ён сваёю сталяркаю, жывучы дзесь у Кацярынаславе, і палажыў іх на кніжку, Пятро зусім не наракаў за гэта на рэволюцыю. Гэта прыхільнасьць да новае ўлады выплывала ў яго ад бескарыснага сэрца, яна паланіла, захапляла яго вялiччам i хараствам ідэі, калі людзі будуць мець роўнае права на карыстаньне дабрабытам, калі ня будзе гэтага абіраньня чалавекам чалавека і зьнікне гэта векавечнае прыгнячэньне багатым беднага.

Дык што значаць яго прапаўшыя грошы ў параўнаньні з тым новым ладам жыцьця, які зараджаўся на яго вачох і якому пагражалі тысячы ворагаў з усіх бакоў і пад рознымі лёзунгамі?

Хіба ў такія моманты можна думаць аб гэтых грошах? Да будзь яны тры разы пракляты!

Ў хаце Пятра была страшэнная беднасьць. Дзеці сядзелі на печы голыя, босыя. Аб хлебе і гаварыць ня прыходзілася. Хлеб замяняўся бульбаю, просам. Ня было нават дроў, і ў той час, калі сяляне, меўшыя коні, вазілі і завальвалі дубамі свае двары, Пятро мусіў на ўласных плячах насіць дровы. Але з лесу іх многа не наносіш, бо лес быў далёка. Прыходзіла-

ся проста адкопваць з-пад сьнегу пні, каб нашчапаць сабе дроў.

Прабаваў зьвярнуцца з дапамогаю да Хведзькі Кандратава, каб паджыцца хлебам. Але хіба то быў чалавек? Хіба меў ён спагаду, сумленнасьць? Сам-то ён еў хлеб, сеяны на самае тонкае сіта, а для Пятра не знаходзілася ні аднаго пудзіка.

З гэтым Пятро яшчэ пагадзіўся-б, бо што рабіць, калі хлеба няма, калі сама Масква, дзе жыве душа і мозг рэвалюцыі,—галадуе. Туды трэба даваць хлеб, трэба падтрымаць тых, у чыіх руках знаходзіліся лёсы рэвалюцыі. Але куды-ж ішоў хлеб, рэквізаваны ў багатых гаспадароў? Ён расходзіўся па руках спэкулянтаў, яго адвозілі ў Рыбінскія Буды і выменьвалі на самагон. І ўсё гэта рабілася з ведама Хведзькі Кандратава.

— Вось хто капае магілу савецкай уладзе,—у вабурэньні душы казаў Пятро:— такіх сволачаў трэба гнаць, расстрэльваць такіх гадаў!

Спадарожны Пятра быў Захар Палянскі, мужык сярэдніх гадоў, досыць заможны гаспадар.

Раман сядзеў пад дубам, то прыслухоўваючыся да грому гармат, то паглядаючы на падарожных. І цікава: у тыя моманты, калі заціхалі гарматы і доўга

ня чуваць было іх грому, Раман чагось маркоціўся, як-бы для яго нешта трацілася; калі-ж іх грукат зноў дрыгацеў у паветры, калышучы і поўнячы яго грознаю музыкаю зьнішчэньня, Раману зноў рабілася страшна і разам з тым і прыемна, бо ў гэтым грукаце чуецца нейкая моц, ёсьць бура жыцьця, а кожная бура і палохае і захапляе.

II

Пятро і Захар ужо былі недалёка. Раман разьвязаў кісет у той надзеі, што ўжо адзін выгляд гасьцінна разьвязанага кісету зьверне на сябе ўвагу падарожных і паслужыць яшчэ аднэю зачэпкаю для таго, каб Захар з Пятром прыселі тут, тым болей, што тутун меўся ня ў кожнага, бо трудна было даставаць яго.

І ён не памыліўся. Пятро і Захар падыходзілі сюды, сур'ёзныя і задумлёныя.

— Чуеце, як грукоча?—Такім запытаньнем спаткаў Раман падарожных.

— Здорава жараць,—адказаў Захар, здароўкаючыся з Раманам.

Пятро, пануры, заклапочаны, моўчкі апусьціўся на дол.

— І дзе-б гэта магло быць?—запытаў Раман.

— А ўжо на гэты бок Белграду,—прамовіў Захар.

— Белград ужо забралі?!—у нязвычайным зьдзіўленьні аж крыкнуў Раман.

— Гэ, Белград! Ужо вёрст на пятнаццаць сюды за Белград прасунуліся.

— А-а-а!—зьдзіўляўся Раман:—мусіцьжа вялікая, брат, яго сіла—столькі гарадоў забраў!

— Афіцар'ё азьвярэлае прэцца,—глуха прамовіў Пятро:—ня могуць яны пагадзіцца з новым парадкам; ім патрэбен цар, ім хочацца зноў пасадзіць сваё дваранства на нашу шыю.

— А ці ня ўсё табе роўна, хто будзе на табе езьдзіць?—адказаў Раман.

— Наўперад езьдзіў пан, а цяпер езьдзяць Хведзькі Кандратавы. У мяне, к прыкладу, забралі дваццаць пяць пудоў; многа табе з іх далі? Як сядзеў, дык і сядзіш бяз хлеба. Даўней хоць мог зарабіць і жыць, як чалавек. А цяпер што? Заработкаў няма, народ зноў пазьбіваўся па вёсках. Забаранілі гандаль, ня можна двух пудоў хлеба прывезьці з Украіны. А ў яго, кажуць, вольная таргоўля.

— Там, брат, таргуюць. Хлеба белага, хоць заваліся. Былі там. Вось нядаўна вярнуўся з Украіны Родзечка з Гахава, каваля нашага сват. Запынілі яго дзяні-

кінцы ў адным месцы. Распыталі, адкуль, і пусьцілі. Толькі кажуць: «Глядзі, каб свае не абабралі. Мы, кажа, праз месяц усю вашу Куршчыну ачысьцім ад вашых камітэтаў».

— Дык яны, значыцца, народу ня крыўдзяць?—запытаўся Раман.

— Не, не чапаюць. З комуністымі і камітэтамі, праўда, распраўляюцца. Зловяць, дык ужо і ведай порцыю: адлічаць табе дваццаць пяць шомпалаў ды ідзі. А хто паважней—расстрэл!

— Знашоў дурань чарапок і сьмяецца,—з горкаю ўсьмешкаю азваўся Пятро:—слухаю вас, хлопцы, і дзіўлюся: чаму вы радуецеся?!—раптам мяняючы тон, накінуўся Пятро:—таму, што будуць вас біць шомпаламі? Галовы-ж вы капусьцяныя: як гэта вы ня можаце зразумець, што Дзянікін, царскі генэрал, нясе вам ланцуг, нагайкі, паліцыю і крывавую расправу.

— А за што ён будзе са мною распраўляцца?—запытаў сярдзіта Раман,—разумеецца, тым не паздаровіцца, хто нарэзаў сабе пасаду ў садох Харланавых, Мархаўцоў і іншых.

Пятро зразумеў, на што ківаў Раман: і яму, Пятру, адвялі кусок саду Харланава для будаваньня.

— А ты-ж сам сьвяты?—пытаньнем адказаў Пятро:—а дубы, якімі пазавальвалі вы свае двары і выганы, адкуль вы бралі? А хто паразвалакаў маёнткі, павыдзіраў апошнія юшкі ў печах? Што-ж ты думаеш: той пан, які прыдзе з Дзянікіным, падаруе вам гэта? Сам прынясеш яму апошні гвозд, што выдралі са сьцяны панскага дому, ды ў ногі будзеш яму кланяцца. Але справа ня ў гэтым. Ты кажаш: «наўперад езьдзіў на нас пан, а цяпер езьдзяць Хведзькі». Што пан езьдзіў, будзе езьдзіць, калі прыдзе Дзянікін,—гэта шчырая праўда. А Хведзька многа наезьдзіў? Хто стаўляе пана і хто ставіў Хведзьку? Як-жа ты гэтага ня можаш зразумець? Хведзька аказаўся—дрэнь, яго выкінулі, як гнілую падэшву, гадзіны лішняе не аставаўся, пад суд аддалі. А пана ты зьменіш? Ды што гаварыць! Адна справа, калі над табою гаспадараць, а другая, калі ты сам гаспадарыш. Вы пачулі пра шомпалы і ўзрадаваліся, даведаліся аб белым хлебе і ўсьцешыліся! Шомпалаў то яны вам дадуць, а вось белым хлебам не пакормяць і гаспадарыць самі і біць будуць вас па мардасах, бо вас можна купіць за белую булку, бо вы няздольны быць гаспадарамі свайго жыцьця... Народ, народ!

Пятро яшчэ штосьць хацеў сказаць, але яму было так горка і крыўдна, а яго слу-

хачы так далёка былі ад таго, што ён ім казаў, што Пятро ня мог далей гаварыць, падняўся, уздыхнуў і пашоў па сьцежаччы. Праз колькі крокаў сьцежачка зьбягала ў яр, густа заросшы кустамі і травою, а ў гэтых кустох разам са сьцежачкаю схавалася і акрытая лахманамі фігура Пятра.

Захар нейкі час яшчэ сядзеў і гутарыў з Раманам. Яны ўжо не зварачалі ўвагі на тое, што гарматы грымелі і рабілі там нейкую справу. Цяпер Захар казаў аб навінах, якія чуў ён у валасьці. Першая і самая грунтоўная навіна—у іх валасьць гэтымі днямі прыдзе дывізія войска, якое, разумеецца, будзе стаяць па вёсках. У іх-жа Ліпавец прыгоняць цэлых два палкі. Дачуўшыся аб гэтым, Раман моцна задумаўся і яшчэ мацней пачухаў патыліцу. Лёгка сказаць—два палкі! Гэта, значыцца, паставяць у двор па 10-15 чалавек і трэба іх карміць. Ну, але раз трэба, то трэба—нідзе ты ня дзенешся. Дрэнна толькі тое, што салдат любіць часамі і ў пограб зазірнуць і ў кубелец з салам залезьці. Таксама не адкіне ён і мёду, а ў Рамана быў добры пчольнік, вульлёў на сорак. Усё гэта моцна засмучала Рамана. Апрача таго, па вёсках пачалі зьяўляцца вайсковыя атрады і вясьці строгую расправу з дэзэртырамі. Забіралі каровы, коні з тых двароў,

дзе былі гэтыя дэзэртыры, бо становішча для рэспублікі стваралася небясьпечнае, прыходзілася прымаць надзвычайна строгія меры.

І тут трэба было Раману паламаць галаву: яго Іванька таксама дэзэртыр.

— Эх, галоўка ты мая!—уздыхаў Раман:—калі-ж гэта людзі прыдуць да чагонебудзь аднаго? Калі скончыцца ўся гэта суматоха?

— Як-небудзь, брат, будзем жыць,— разважаў Захар,—а там відаць будзе. Ня можа-ж быць: будзе які-небудзь парадак, а там і вайна гэтая скончыцца, хто-небудзь, а возьме верх. А наша, брат, дзела што? Мікалай быў—мы зямлю аралі; зьявіўся Керанскі—аралі, пры бальшавікох—таксама аром; Дзянікін прыдзе, чорт, д'ябал,— мы ўсё будзем у зямлі капацца.

Захар падняўся і пашоў да сяла, а Раман яшчэ крыху пасядзеў пад дубам, а потым пашоў да сваіх калесеяь, зьбіраючыся ехаць дадому.

Новы клопат, новыя думкі агарнулі Рамана.

А гарматы, прыціхшы на нейкі час, зноў грымелі грозна і страшна. Цяпер іх размова для Рамана мела больш вызначаны сэнс. На душы было неспакойна, трывожна. Прынесеныя Захарам навіны моцна за-

смучалі Рамана. А горш за ўсё гэтыя атрады. Ужо даўно цягнецца гэта гісторыя з дэзэртырамі. Многа разоў прысылаліся грозныя прыказы з ваенных камісарыятаў аб дэзэртырах. Многа разоў хадзілі ваякі ў павет і зноў варочаліся дадому праз месяц ці колькі нядзель. Цяпер-жа, відаць, цьвёрда паложана зрабіць канец дэзэртырству.

«Наскочыць атрад, захопіць Івана, тады прахам пойдзе твая гаспадарка»—думаў Раман: «трэба што-небудзь думаць, бо йначай—бяда».

Раман запрог каня, палажыў на драбінкі плуг і мернаю ступою паехаў паўскрай яру.

Дарога, агібаючы яр, забірала ў поле, потым зноў павярнула канец свае дугі ў бок сяла. Перад самым сялом цягнуўся роўны, прасторны выган. Каля платоў па выгане віднеліся высокія круглыя кучы наваленага гною. У вапошнія годы гаспадары перасталі вазіць яго на поле.—«Што вазіць яго», разважалі яны: «я ўгнаю поле, а на другі год ім будзе карыстацца другі».

Так і валяўся гной па выгане бяз усякае карысьці. На гэтым-жа выгане стаялі ветракі, спыніўшы свае крыльлі. Раман таксама меў вятрак. Раманаў вятрак стаяў зусім блізка ад дарогі і меў вельмі прыгожы выгляд. Асабліва многа хараства прыдаваў

яму самы верх, накрыты чырвоным жалезам.

Але ў гэту мінуту ён ня цешыў Рамана і меў таксама смутную выразу свайго аблічча, як-бы ён спагадаў свайму гаспадару.

Праехаўшы крыху выганам, Раман зьвярнуў да свае клуні. Каля клуні быў Іван. Іван моўчкі стаў выпрагаць каня. Колькі мінут бацька і сын маўчалі.

Раман скоса, украдкам паглядаў на сына. Яму хацелася пагаварыць з ім аб тым, што ён дэзэртыр і якія вынікі можа мець гэта дэзэртырства для іх гаспадаркі. Выпраглі каня. Прывязалі каля «кармушкі». Іван вынес з клуні ў кашалі сечкі.

— Чуў?—зьвярнуўся Раман да сына:—дзянікінцы ўжо Белгарад забралі.

— Па гарматах чуваць, што па гэты бок Белгараду бой ідзе,—адказаў Іван, высокі шырокаплечы дзяцюк, адзеты напалавіну ў казённае.

Раман пачухаў патыліцу.

—Але вось што, Іванькя,—вымаўляючы слова «Іванька» на курскі лад, сказаў Раман:—па вёсках, кажуць, зьяўляюцца вайсковыя атрады, ловяць дэзэртыраў, а гаспадарку іх нішчаць, не захапілі-б і цябе.

— Такія выпадкі ўжо былі,—панура адказаў Іван:—на Данскім хутары з трох

двароў пабралі каровы і коні; дзядзя Кандрат сказываў.

— Пабралі?!—апаўшым голасам спытаў Раман:—бач, ты, якія дзяла.

Паўмачалі.

— Нічога, баця, не паробіш, а йсьці-та трэба.

Раман уздыхнуў.

— Ах, ты грэх які! э-хэ-хэ!—цмакаў Раман і чухаў патыліцу.

— А ты, Іванькя, глядзі, з розумам рабі: убачыш, што дзела ня выходзіць, дык ты... таго.

— Ведаю, баця, вайсковую службу,—усьміхаючыся адказаў Іван:—варон страляць ня буду, а «прымяніцца да меснасьці», як вучыць салдацкая мудрасьць, здарэньня не прапушчу.

Так развaжаючы, бацька і сын чулі нейкую фальш і стараліся не глядзець адзін другому ў вочы.

— Якая гэта вайна,—стараўся Раман знайсьці якое-небудзь апраўданьне: хіба гэта вайна?

У хаце за сталом яшчэ пагутарылі аб тым, што Івану трэба йсьці на службу. Бабка Параска, жонка Рамана, трохі плакала па Іване, але ня моцна, бо ўжо прывыкла да яго частых мобілізацый. «Маладайка» Матрона, Іванава жонка, была маўклiва,

Іван толькі зімою пажаніўся з ёю, і жылі яны надта згодна. Матрона была высокая, стройная, прыгожая жанчына. Відаць, яна вельмі маркоцілася, што Іван заўтра пойдзе. Яны часта заставаліся ўдваіх і ціханька перакідваліся словамі. Меншыя браты й сёстры Івана, папалуднаваўшы, пашлі на вуліцу. А на вуліцы было так цікава. Сталыя мужчыны зьбіраліся ў гурткі і развагалі аб вайне, якая насоўвалася на іх. Тутжа расказваліся вельмі цікавыя навіны, падымаліся гарачыя спрэчкі, наогул жыцьцё біла з кожнага кута. Па сяле хадзілі самыя няскладзістыя чуткі.

III

На другі дзень раніцаю, чуць толькі паказалася сонца з-за таго лесу, што стаяў каля воласьці, Іван быў ужо гатовы да паходу. Цяпер ён зусім выглядаў салдатам. За плячамі ў яго быў досыць пакоўны мяшок з хлебам і скорамам, прыладжаны на палаценцы. Яго спадарожныя, тры таварышы, такія-ж, як і ён ваякі, ужо пастукалі ў акно, клічучы Івана да свае кампаніі.

— Я даганю вас, хлопцы: ідзеце памалу,—сказаў Іван. Папрашчаўся з бацькамі; Раман, Параска і Матрона правялі яго на двор. Ісьці вуліцаю было нейк нялоўка. Іван пашоў дваром каля клуні. Тут яшчэ затры-

маліся, а Раман сказаў на дарогу сыну колькі слоў, сэнс якіх зводзіцца да таго, каб усё рабіць з розумам.

— Ну, шчасьліва,—прамовіў апошнія словы Раман і павярнуў у клуню. Маці стаяла яшчэ колькі мінут і пазірала на Івана. Матрона пашла з Іванам.

— Падыйду з табою да гэтага лесу,— сказала яна, заглядаючы з любасьцю ў вочы Івану.

Агародамі вышлі яны на выган і павярнулі па дарожачцы, што йшла каля плоту.

— Не даюць нам, Іванька, спакойна жыць. Хоць-бы дзянёк таго спакою. І дома ты, а сэрца не на месцы. А пойдзеш—і таго горай.

У Івана таксама на душы было цяжка, а ў галаве варушыліся цэлым роем думкі. І хацелася сказаць маладой жонцы, і нават думкі добрыя былі, толькі слоў не знаходзілася адпаведных. І Іван ішоў радам з Матронаю, заглядаў ёй у вочы і толькі вачамі і сьмехам выказваў ёй свае думкі.

Дашлі да лесу. Лес, праўда, пачынаўся недалёка ад выгану. Праўда кажучы, гэта і ня лес быў, а проста так зваўся па старой памяці.

— Глядзі-ж ты, Матрона, ня вельмі-та па вуліцах вечарамі разгульвай,—сказаў прыпыніўшыся Іван.

— Ну, што ты, Іванькя! Як-жа я, мужняя жонка, гуляць пайду?

І паглядзела на Івана з такім дакорам.

Іван абняў яе моцна; моцна і крэпка пацалаваў у сьвежыя і сакаўныя губы.

Пацалаваў і шырокімі крокамі пусьціўся даганяць сяброў.

Матрона, смутная, пастаяла трохі, покі не схавалася фігура Івана за выступам яру, куды павярнула дарога, а потым пашла на свой агарод зьбіраць зельле, падаткнуўшы спадніцу.

Шкода было Раману сына, але-ж за тое было і шмат спакайней. Бяз пэўнае думкі расчыніў ён у клуню вароты, вашоў туды, аглядзеў сьцены, зірнуў на кучы саломы і вышаў на двор. Крыху пастаяў, зашоў у пчольнік, прашоўся між вульлёў. Ніякае работы на гэты дзень ён яшчэ не назначыў сабе. Дый ахвота нейк адпала за дзела брацца. Яго пацягнула на вуліцу. На тым баку, пасярэдзіне сяла, цягнуўся глыбокі і шырокі яр; з вуліцы чуўся гоман. Раман ужо хацеў пакіравацца туды, але так добра знаёмы са ўчарашняга дня гук зноў пачуўся Раману. Ён зашоў за клуню і стаў слухаць. Грозны гук паўтарыўся грозна і выразна. Ціхае і вільготнае паветра раніцы прыдавала яму яшчэ большую сілу.

Здавалася, што гарматы грымелі цяпер шмат бліжэй.

Каля Бажковай клуні таксама стаяў і Пятро Мазалеўскі. Свае клуні Пятро ня меў.

Раман пашоў да Пятра паздароўкацца.

— Мне здаецца, што сёньня гарматы як-бы аддаліліся,—прамовіў Пятро.

— Дзе ты бачыў, аддаліліся,—зусім блізка грукацяць!

Як-бы прыпыняючы іх спрэчку, пракаціўся густы, выразны, акруглены гук.

— Чуеш?—сказаў Раман.

— Што-ж, — прамовіў Пятро: — пры стычках усяк бывае. Зарвецца дзе іх банда, вось і выбіваюць.

— Банда, то банда, але глядзі, куды дашлі... Нічога, мусіць, брат, ня будзе, калі ў іх парадак моцны, дысцыпліна, бранявікі, танкі і ўсё, што хочаш.

— Ну, бранявікі! а ў нас, ты думаеш, бранявікоў няма? Прагналі-ж Калчака. Цяпер з таго фронту сюды гоняць войска. Яшчэ, брат, рана ім казырыцца, яшчэ ўсё можа быць.

— Не, Пятро,—круціў Раман галавою:—штось на гэта не паказвае. Чуткі ёсьць, што ўжо і Курск вывозіцца. Трудна, брат, з імі змагацца.

Пятро маўчаў. Дый што тут казаць. Хіба ты яго пераканаеш. Радуецца кулаччо, бо не па нораву яму новая ўлада.

Раман пашоў на вёску паслухаць, што гавораць людзі. Пятро таксама павярнуў у свой двор. Стаяць на вуліцы і слухаць гэту кулацкую гутарку яму было прыкра.

«Ах, вы жылы, жылы!» разважаў сам з сабою Пятро: «чакаеце Дзянікіна, ня люба вам, што бедната галаву падняла. Каб часам-жа і самі не заплакалі!»

Нявесела было на душы ў Пятруся. Перш быў за дзела ўзяўся, плот паставіў на сваім надзеле, падгатаўляў мясьціну, каб перанесьці туды сваю хату. Думаў пачаць памалу будавацца. Цяпер-жа ўсё гэта спынілася.

«Задушаць, усё задушаць і зьнішчыць могуць, сволачы!»

Так і спыніў сваю работу Пятро, бо нашто рабіць? Калі прыдуць дзянікінцы, то ўсё будзе зьнішчана ды яшчэ і самога калаціць будуць. Але ня гэта страшна,— страшна, што стары парадак можа вярнуцца. Заможнае сялянства пачало падымаць галаву. То там, то сям стаялі гурткі заможнікаў, якія так ці йначай лічылі сябе пакрыўджанымі беднатою і ў глыбі душы, хоць аб гэтым яшчэ не адважваліся казаць у голас пры ўсіх, былі рады прыходу Дзя-

нікіна. Цішком перадавалі адзін аднаму аб добрых зьменах жыцьця, якія будуць тады, калі ня будзе ўлады чырвоных. Раман колькі разоў абменьваўся думкамі з людзьмі і яшчэ болей праконваўся ў тым, што верх возьме Дзянікін, і ўжо пачынаў чакаць яго. Тымчасам прыбліжэньне фронту і сур'ёзнасьць палажэньня адчувалася моцна. Прыходзіла войска, разьмяркоўвалася на больш-менш доўгі час, а праз дзень, другі, яно кудысь выходзіла. Прыбывалі новыя вайсковыя часьці, але доўга не затрымліваліся і перакідваліся то на адзін, то на другі пункт фронту.

А гарматы грукацелі бліжэй.

Раман чутка прыслухоўваўся да ўсяго, што рабілася вакол. Вайна была ўпартая, і часта фронт хістаўся то ў адзін, то ў другі бок, а разам з гэтым то падымаліся, то ніклі надзеі заможнікаў і бедняты. Калі ўдача была ў чырвоных—ажывала бедната і паказвалася на вуліцы. Тады можна было пабачыць і Пятра. Ён выхадзіў на вуліцу, шырока расстаўляў ногі і казаў:

— Не, брат, зьбілі Калчака—таксама далёка зашоў,—саб'юць і Дзянікіна. Усяго народу не ашукаеш і за белы хлеб ня купіш... Што тут талкаваць? Рана вам радвацца,—і Пятро кідаў вочы на крытыя пад жалеза хаты заможнікаў.

Пры спатканьні з Раманам Пятро ня мінаў казаць:

— А гарматы ледзь-ледзь ужо чуваць.

Раман дыплёматычна адказваў:

— І дзякуй богу! Ты-ж думаеш, добра было-б, каб фронт прашоў праз наша сяло?

Так казаў Раман, а сам думаў ня тое і адчуваў засмучэньне, асабліва пасьля таго, калі яго залучылі ў абоз чырвоныя і патрымалі яго з тыдзень, а ў гэты час невядомыя ласуны крыху пахадзілі каля вульлёў без дазволу Рамана.

Раман зноў зьбіраў навіны і, нават, заходзіў да бацюшкі пагутарыць аб справах вайны.

Бацюшка стаяў у самым асяродку навін і на справу пазіраў сьветлаглядна.

— Думаеш, яго сілаю прымусіш адыйсьціся?—казаў бацюшка:—сам адступіў, бо правае крыло на фронце Ўрангеля адстала, а левае залішне высунулася. Але туды паслалі генэрала Шкуро. Гэта, брат, генэрал! Другі Суворай!

Раман весялеў—што значыць вучоны чалавек!

Такое хістаньне вайны цягнулася колькі месяцаў. Раман проста змучыўся, чакаючы рашучых вынікаў вайны. Паміж заможнікаў зладзіўся, нават, пагляд, што

Дзянікін ня йдзе проста дзеля таго, каб даць людзям сабраць з палёў.

Раз, пад канец лета, калі гармат колькі дзён зусім ня было чуваць, Раман пачуў, як яны зноў ажылі і загрымелі часта і моцна.

Убачыўшы Пятруся, ён сказаў:

— А чуеш, як блізка зноў грукацяць?

— А мне здаецца,—адказаў Пятрусь,— што яны ўсё на адным месцы.

Але выраза твару Пятруся казала за тое, што гарматы ня вельмі далёка.

Пад вечар таго-ж самага дня стала вядома, што Дзянікін прашоў раку Псёл, а да Псла адгэтуль было ня болей, як дваццаць вёрст. Гарматы грымелі ўжо так, што зямля дрыжала. Блізкасьць вайны адчувалася цяпер усімі. Сярод вайсковых часьцей замячаўся нязвычайны рух. Відаць было, што чырвоныя войскі адыходзілі. Цэлы шэраг хурманак пацягнуўся на поўнач у кірунку на Курск; за хурманкамі праз нейкі час адыходзілі і баявыя ланцугі. Палажэньне станавілася вельмі напружаным. Дзесь, ня вельмі далёка, тухкалі кулямёты, а на горцы ў полі пачалі ўздымацца высокія слупы дыму і пылу. Гэта—выбухі ад снарадаў. Людзі пахаваліся: сяло, здавалася, апусьцела.

Раман чуў, як нейкі страх агарнуў яго душу. На яго вачох выяўлялася разьвязка

вялікага змаганьня, сэнс якога ён ня мог ахапіць розумам, але ў сэрца закрадвалася цёмная трывога.

Змоўклі гарматы, сьціхла частае тухканьне кулямётаў. Зрабілася ціха і пуста. Чырвоных ужо ня было, а белыя яшчэ не паказваліся.

Раман стаў разглядацца і патрошкі прыходзіць у сваю звычайную плынь жыцьця. Ён вышаў на двор, аглядаючы свой будынак і сваю гаспадарку. Зрэдка грукацелі гарматы, але ўжо збоку і ў другім месцы. Абярнуўся Раман назад і абамлеў: з вуліцы ў двор уварвалася нейкая, яшчэ ня бачаная ім, банда ўзброеных людзей. Не спадзяючыся нічога добрага, Раман, моцна перапалоханы, падаўся ў патайны кут двара. Сэрца яго крэпка забілася.

У хаце была жонка і нявестка Матрона.

Банда ўвалілася ў хату. Матрона забілася ў цёмны куток сяней і ўся дрыжала.

— Балшавік няма?—пытаўся адзін з шайкі нейкаю ломанаю моваю, а вочы бегалі, як у злодзея.

— Няма, няма,—запэўняла перапалоханая гаспадыня.

Банда борзда крутнулася па хаце, акідаючы поглядам куты і набытак, потым вышла ў сені. У сенях стаяла скрыня Матроны. У гэтай скрыні былі схаваны яе

лепшыя рэчы: адзеньне, палотны, абрусы, залатыя пярсьцёнкі, рублёў дваццаць срэбра і дзьве залатыя пяцёркі.

Адзін з шайкі, чорны, калматы, як зьвер, узламаў шабляю скрыню і пачаў перабіраць і выкідаць з скрыні тыя рэчы, якія яму больш падабаліся, а больш дробныя і каштоўныя—клаў у кішэню. Другія падбіралі з зямлі хусткі, абрусы.

— Што вы, падлякі, робіце?!—крыкнула Матрона і выскачыла з кутка. Грабежнікі зьнячэўку прышлі ў замяшаньне.

Чорны, акінуўшы Матрону вачамі, расплыўся ў нядобрую ўсьмешку.

— Карош баба! карош баба!

Ён кінуў скрыню, падышоў да Матроны і раптам абняў яе крэпкімі рукамі.

Матрона ў гневе, у страсе стала крычаць, адбівацца, але чорны трымаў яе моцна.

— Пайдэм, дюша мая, пайдэм!—і павалок маладзіцу ў глыб двара.

Матрона баранілася з усіх сіл, біла яго па твары, чаплялася рукамі ў яго бараду, крычала, клікала людзей, але ніхто не паказваўся і ня йшоў бараніць.

— Нычаво, нычаво, ны бойся!—казаў чорны, а вочы яго гарэлі дзікім агнём.

Ён зграб яе на рукі і панёс у клуню. Матрона змаглася і самлела. Чорны нагою адчыніў клуню і панёс маладзіцу туды.

Раман ня мог болей хавацца. Ён схапіў вілы і кінуўся ў клуню, як зьвер, ратаваць сваю нявестку.

— Погань разбойная, што ты робіш?!—наляцеў Раман з віламі, гатовы прасадзіць яго.

Грабежнік кінуў Матрону, выхапіў шаблю і спрытна адбіў удар, пры гэтым расьсек Раману пальцы.

На яго шчасьце пачалі зьбягацца людзі, падняўся крык, лямант. Чорны, дзіка азірнуўшыся, моцна таўхануў Раману ў грудзі, зьбіў яго з ног і, махаючы шабляю, пабег да свае банды. Аграбіўшы Раманаву хату, банда пашла на другі бок сяла праз яр.

Прашло з месяц часу. Сялянства на ўласных гарбох адчула ўсю асалоду дзянікінскіх парадкаў. Не па аднэй сьпіне згуляла поліцэйская нагайка. Зямляўласьнікі шчыра сталі зьбіраць свой набытак, адбіралі ад сялян кароў, коняй, цягалі іх па судох за сьсечаны лес.

І вось, калі зноў пачуліся стрэлы гармат, на гэты раз ужо з поўначы, а Раман і Пятро стаялі і слухалі іх, і калі Пятро сказаў:

— А ці не здаецца табе, што гэтыя стрэлы раз-по-раз чуюцца бліжэй?

Тады Раман з сьвятлеючым тварам і ад шчырага сэрца адказаў:

— Так, так: гром падбліжаецца!

---

## ДЗЯЛІЦЬБА

I

Ну, што ты з гэтымі бабамі зробіш?

Калі ў хаце жывуць дзьве бабы, то ўжо спакою няма.

— Гыр-гыр-гыр! гыр-гыр-гыр!—гыркаюцца яны ад самага раньня.

Адна—капач, тая—мешалка. Адна—гультай, другая—няўмека.

Так і кідаюць адна аднэй на вочы.

А як лягуць спаць, то кожная ўсю ноч шэпча на вуха свайму мужыку,—нагаварвае на другую.

Мужчыны толькі скрыва паглядаюць адзін на аднаго. Але, пакуль што, маўчаць.

Да дзяліцьбы яшчэ далёка. Дзяліцьба ідзе вось у якім парадку: перш-на-перш выступаюць бабы.

Бабы сварацца год, год з палавінаю, а то і цэлых тры. Мой нябожчык-дзед казаў, што яго нябожчыца-жонка сварылася з яго нябожчыцай-братавай цэлых дванаццаць год! Наўперад бабы сварацца патроху,—так, гадзіну, дзьве ў дзень.

Потым сварцы адводзіцца больш часу—гадзін 5-6.

Да гэтага часу мужчыны яшчэ маўчаць, набіраюцца толькі злосьці. Мужчыны сварацца часьцей увечар, ці ў сьвяты дзень, бо ў будны часу няма. А бабы тымчасам пачынаюць прабаваць моц сваіх чубоў. Вараць яны ў аднэй печы, але ў асобных гаршчкох. Дастаецца тут і бедным гаршчком.

А ўжо пасьля жанок б'юцца мужчыны.

Каб падзяліцца, яшчэ мала пабіцца адзін раз: трэба пабіцца найменш раз восем, каб разы тры засыхала скурка на носе, трэба разоў шэсьць абадраць твар ды ліхтар паставіць каля вока, а лоб убраць гузам або і двума. Тады толькі можна лічыць, што права на дзяліцьбу здабыта.

II

Дзякуй богу, што бог сярдзітым людзям не дае многа сілы.

Сымон яшчэ змалку паказаў сваю злосьць. Раз ён завёўся за нешта з сваёй сястрой Марцэляй. Сымон так узлаваўся, што ўкусіў сястру за жывот. А то ўжо быў Сымон дзяцюком. Любіў ён часамі зухнуць. Загнаўшы да Коўны плыты, ён купіў сабе стары афіцэрскі сурдут. Бацька дома і давай прабіраць за гэта Сымона. Сымон кінуў вобзямлю сурдут, пачаў таптаць яго

нагамі; потым парваў на сабе кашулю, порткі, залез голы на жорны і сказаў:

— Так пан Езус пакутваў!

Мікола ня ўступаў у злосьці свайму брату Сымону. Так, раз ён паехаў на поле па ячмень. Падымалася хмара, грымела. Мікола наклаў воз на борздую руку. Толькі што ён нукнуў на каня,—шусь ячмень з возу! Мікола закіпеў, узлажыў другі раз. Не пасьпеў ён выехаць на дарогу—ізноў бух ячмень з возу!

— То ты гэтак?!—крыкнуў Мікола. Схапіў тут рубель [1]) і давай малаціць ячмень. Памалаціў, вытрас, салому палажыў на воз і сам сеў.

— Вось ты цяпер раскідайся, праклятты!

Другі раз Мікола пабіў у сваёй хаце вокны, місы, гаршчкі. Нічаму не давала спуску качарга. Пабіўшы ўсё, што можна было пабіць, Мікола стаў сярод хаты і пазірае, што-б яму яшчэ пабіць. Вокны, гаршчкі, міскі былі ўжо пабіты. Аж бачыць Мікола—абразы на сьцяне вісяць. Многа іх, штук са дванаццаць. Адзін абраз быў намалёван так, што сьвяты з гэтага абраза пазіраў у вочы. Куды-б ні павярнуўся, а ён

---

[1]) Рубель—жэрдка для ўцісканьня снапоў і саломы.

на цябе глядзіць. Убачыў Мікола гэтага сьвятога.

— А ты чаго глядзіш? Першы раз бачыш мяне?

І як заняў качаргою сьвятых—пабіў іх у дрэбезгі.

— Што, будзеце пазіраць на мяне?— спытаў Мікола, кончыўшы расправу.

Сымон і Мікола сварыліся ўжо гадоў са тры, а за апошнія часы сталі і біцца, а гэта азначала, што скора будзе дзяліцьба.

Сымон і Мікола ў нашым сяле былі тым, чым у горадзе тэатр, толькі што білетаў ня трэба браць: прыходзь сабе, слухай, пазірай, весялі сваю душу.

І Карусь з-пад карчмы кожны вечар стукаў у вакно свайго суседа Базыля.

— Чаго ты?—пытаўся Базыль.

— Хадзем у Сьвіную вуліцу: зараз будзе бой.

Базыль апранаў кажух, браў капшук з люлькай і йшоў на двор. Закурыўшы люлькі, яны йшлі ў Сьвіную вуліцу. Карусь паперадзе, Базыль на два крокі ззаду. У Базыля ў люльцы быў цыбук просты, у Каруся—крывы. Дым з Базылёвай люлькі йшоў згары, а з Карусёвай—зьнізу.

III

А ў Сьвіной вуліцы, каля хаты Сымона й Мікалая была ўжо цэлая комэдыя.

Тут былі і старыя, і малыя, і бабы, і дзяўчаты.

Галоўнае месца займалі Сымон з Мікалаем. Сварка з першых слоў абяцала цікавы бой. Вакол ваяк стаяла жывая сьцяна народу.

Наперадзе стаяла некалькі чалавек, якія борзда ўмелі зьвясьці Сымона з Міколам. А другія толькі пазіралі. Калі «звадыяшы» бачылі, што бойка раскідаецца, то тады ўмешваліся яны.

— Эй, Сымон! Як табе ня брыдка? Міхола даў дулю, а ты толькі нос адхіліў!

— Дык я яму дам дзьве!—крычаў Сымон і соваў Міколе дзьве хвігі.

Другі звадыяш пхаў Міколу на Сымона, і бойка гатова!

Але на гэты раз звадыяшам ня было чаго рабіць: Базыль з Карусём—а яны заўсёды прыходзілі толькі к самаму пачатку комэдыі, як якое начальства— убачылі вось што: Сымон трымаў у руках млён, а Мікола—грамнічную сьвечку. Сьвечка была мала чым менш ад млёна— палкі, якою круцяць жорны. Аказалася, што бой быў у хаце, і Сымон прыпёр Мі-

колу ў куток. А як бараніцца ня было чым, то Мікола і схапіў сьвечку, што стаяла каля Міколы. Мужчыны адабралі ад іх млён і сьвечку.

Нейкі чорт так і цягнуў байцоў аднага да другога.

Зьляпіліся...

Такая была цікавая бойка, што аж месяц залюбаваўся ёю. Усё сьціхла.

Ужо Мікола быў тры разы на Сымоне і тры разы пад Сымонам, а бой усё ідзе. Патаміліся яны, як пеўні.

— Стой! Стой!—крыкнуў Сымон:— дай абору падвяжу!

У бойцы разьвязалася абора на Сымонавым лапці. Мікола спыніўся.

— Гы-гы-гы!—рагатаў Карусь.

Сымон стаў падвязваць абору, а Мікола стаяў каля яго: чакаў.

— Ну, цяпер!—гукнуў Сымон, паправіўшы лапаць.

Мікола ня даў нават Сымону адсапнуцца і наляцеў на яго, як каршун. Сымон прыгнуўся яшчэ больш і схапіў Міколу ўпол так, што ногі ў Міколы апынуліся ўгары, і так спрытна бурхануў Міколу, што той стаў на ногі.

— Чакай, чакай, Сымон!—загаласіў разам Мікола.

І пакуль Сымон агледзіўся, што такое прылучылася, у грамадзе падняўся рогат. Карусь выпусьціў з зубоў люльку, а Базыль выпер рукою шыбу. Усе аж трашчалі ад сьмеху: у Міколы спаўзла ніжняя адзежына.

Нават Сымона праняў сьмех.

— Вось як біцца з Сымонам!—гаварыў ён.

І пакуль Мікола апранаўся, Сымон накладаў у люльку тутун з поглядам чалавека, верх якога быў бясспрэчны.

# КІРМАШ

## I

— Адно-ж ты, Пятруська, ня баўся на кірмашы. Сюды-туды дый да дому. Прыедзь хоць раз, як чалавек.

Кожную нядзельку дзяўбла Кася Пятрусю адно й тое, і Пятрусь іншы раз засярдуе. Яму не падабалася такая апека жонкі.

— Ото, як ты баішся!

Пятрусь сеў на воз, сарваў сваю злосьць на кані, сьцебануўшы яго пугаю разоў са тры, каб заадно нечага й жонцы задаць страху.

Палавіну дарогі—а гэта будзе вёрст пяць—Пятрусь быў сярдзіты. Падумаць, дык выходзіць, што жонка кажа праўду: ці-ж добра, каб хто спытаўся, прапіваць грошы? І Пятрусь стаў думаць аб тым, як ён ужо раз дваццаць абяцаў жонцы ня піць гарэлкі і заўсёды прыяжджаў да дому п'яны; як ён ашукваў яе, прыкідваючыся цьвярозым,—для гэтага ён стараўся хадзіць роўна. Часам яму і ўдаецца зрабіць колькі роўных крокаў, а потым, па-

зіраеш, гарэлка павядзе ў бок. Тады ён кідаўся на другую хітрасьць.

— Оё-ёй!—стагнаў тады Пятрусь:— от-жа кальнула! Бадай ты згарэла!

Пятрусю рабілася брыдка прад самым сабою ад адных гэтых думак.

— Не, трэба такі кінуць піць,—гаварыў сам сабе Пятрусь і разьвясельваўся.

Прыехаўшы да места, Пятрусь выпраг каня, павесіў яму на галаву торбу з сечкаю і агледзіўся. Усё места было застаўлена вазамі. Сяляне хадзілі ў лапцях і мясілі балота. Каля вазоў снавалі гандляры і гандляркі. Хто прадаваў масла, хто сала. Тут-жа стаялі цэбры, ражкі, вёдры. Усякага было народу. Былі й такія, што нічога ня куплялі і не прадавалі, а прышлі так сабе «на раздабыткі». Прыдзе сабе ў краму, патупае, патупае, а як што кепска ляжыць, то й запусьціць «ляшча». А калі яго лавілі, то ён спакойна гаварыў:

— Колькі гэта каштуе, Малка?

Агледзіўшыся вакол, Пятрусь пашоў рабіць свой абход з мяшэчкам і з торбачкамі пад пахаю. Трэба ўзяць солі, мукі, вотрубей.

Куча народу. У сярэдзіне важна сядзіць рускі, разлажыўшы сваіх багоў. У другой грамадзе народ акружыў чалавека з круцёлкаю і пазіраў, як прабаваў

хто шчасьця: клаў дзесяткі і грыўні і круціў. Каму пападаўся кубак, каму мыла, каму іншая рэч, а каму, як кажуць, гула асмаленая.

Трэцяя, яшчэ большая грамада народу стаяла каля дому з вывескаю: «Казенная винная лавка № 67». Тут былі бабы й мужчыны. Хто выбіваў корак з кварты, з поўкварты, а хто, адвярнуўшыся ад людзей, каб не сароміць іх,—з маленькага кручка. З дваццаць людзкіх галоў было задрана ўгару так, што нос прыходзіўся якраз проці самай сярэдзіны неба. Хто піў з вялікай бутэлькі, той трымаўся сьмела: станавіўся на самае віднае месца, падпіраў аднэю рукою бок і важна цягнуў гарэлку.

А калі хто ішоў з «буслам»,—прад тым людзі расступаліся і давалі дарогу, як якому спраўніку.

II

За гоманам трудна разабраць, хто што гаворыць. Вот дзьве бабы: адна аперлася на воз з аднаго боку, другая з другога. Абедзьве выпіўшы. Адна гаворыць груба, другая тонка. Мова першай бабы падобна да кароткіх слоў:

— Ды-ды-ды-ды!

Другая сыпала танчэй і яшчэ скарэй:

— Дэ-дэ-дэ-дэ!

На другім возе сядзяць тры гаспадары. Два з іх абнімаюцца й цалуюцца.

— Братка ты мой!—гаворыць адзін:— твой Алесь—золата, а не чалавек.

— Галубок ты мой!—кажа другі:— дальбог я цябе люблю. Каб я жонкі ня ўбачыў, калі ня люблю. Дай сюды тваю морду... во так! Пойдзем яшчэ вып'ем поўкварты.

Два шчырыя сябры злазяць з воза, абнімаюцца, цалуюцца, адзін аднаго падтрымоўваюць і ідуць да манапалькі.

— Га, Пятрусь, і ты тут?—сустрэў Пятруся Карусь Акалот. Вочы яго былі ўжо, як у салавейчыка, а з губы нясло, як з бочкі.

— А вот, як бачыш,—сказаў Пятрусь.

— Ідзі, брат, паглядзі, якога я купіў падсьвінака.

Карусь схапіў Пятруся за рукаў і павалок яго глядзець падсьвінака.

Пятрусь пахваліў гэту маладую асобу і сказаў Карусю, што добра купіў.

— Добра, кажаш?

— Вядома, што добра.

— Калі так, то пойдзем у «Порт-Артур».

«Порт-Артурам» звалі хатку, што стаяла разам з крамкаю.

Гэта хатка заўсёды была паўнютка людзей. Там стаяў такі шум, крык і гоман, што аж глушыла. А раз зашоў у «Порт-Артур», то выйсьці адтуль ня так-то лёгка: ці мала там сустрэнеш добрых людзей?

— Не, не пайду!—сказаў Пятрусь.

— Чалавек! па чарцы!

— Няма, брат, часу,—стаяў Пятрусь на сваім.

— Колькі там таго часу? Поўгадзіны, ня больш. Хадзем!

Пятрусь трохі ўпіраўся, але такі пашоў. «Чарку, дзьве—ня больш», думаў ідучы Пятрусь.

З «Порт-Артура» ён ішоў надта вясёлы і сьпяваў песьні.

III

Вечар быў хмуры. Ні зор, ні месяца.

Ускаціўшыся на воз, Пятрусь завязаў лейцы за аглабіцу і лёг.

Увесь сьвет, здавалася яму, скакаў лявоніху. Калі-ні-калі Пятрусь падымаў галаву, крычаў: «Но, малы!», цмокаў губамі і сьвістаў.

Конь ішоў памалу, як хацеў і кудою хацеў. Разоў некалькі зачапіў ён восьсю аб хвою і скінуў атосу. Калёсы стукаліся аб карэньне, плюхалі па гразі і каціліся бокам. Такім парадкам пракаціліся яны

вярсты тры. У вадным месцы, каб абыйсьці гразь, конь зьвярнуў з дарогі, усьцягнуў калёсы на пень, сарваў са шворна цялежкі і аставіў драбіны з Пятрусём сярод лесу, а сам паклыгаўся з цялежкамі далей.

Паляжаўшы з поўгадзіны, Пятрусь падняў галаву, цмокнуў і крыкнуў:

— Нс-о-о, малы, варушыся!

Было ўжо зусім відна, як Пятрусь прачухаўся трохі і падняў галаву.

— Што за ліха? Што гэта? Дзе-ж гэта я? Тфу! тфу! тфу! Згінь, прападзі!

І Пятрусю ўспомнілася ўсё.

— Што я зрабіў?—загаласіў Пятрусь, заламаўшы на галаве рукі.

Стыд перад жонкаю, перад людзьмі, злосьць на самога сябе, на тых, хто выдумаў гарэлку, прапажа каня,—усё гэта зьвязалася ў адзін цёмны клубок.

— Ну, не сабака-ж я, ня гад, не лайдак? Што я раблю найлепшае? Чаму няма агню на гэту атруту людзкую?!

Зьняў Пятрусь драбіны, сеў на пень.

— Што рабіць, што чыніць?

Папрабаваў быў Пятрусь цягнуць да дому адны драбіны і нават працягнуў іх з поўвератня.

— Не! як я пакажуся людзям у вочы? Прапіць каня і самому цягаць драбіны?

Ён звалок драбіны з дарогі і, апусьціўшы галаву, пашоў да дому. Падышоў ён з вярсту, бачыць—стаіць яго конь, зачапіўшыся лейцамі за корань.

— Конік ты мой, залаценькі!—закрычаў з радасьці Пятрусь і пацалаваў у самую мызу свайго худога мышака.

А потым пацалаваў Пятрусь зямлю і прысягнуў, што ніколі ня будзе піць гарэлкі.

# ЧОРТ

## I

— Братка ты мой, Іван! Ты знаеш, як я цябе люблю! Ну, дай—пацалуемся! Во, гэтак!.. Назавеш ты Міхася сабакаю, лайдаком, калі пачуеш ад каго, што я табе кепска мысьлю.

— Братка ты мой, Міхаська! Забі мяне пярун, во тут, у гэту ночку, на гэтай дарозе, калі я ня люблю цябе. Дай і я цябе пацалую!

І сябры зноў сталі цалавацца.

Міхась і Іван—лясьнікі. Зашлі яны да цёткі Хрумы і трынкнулі, што называецца. А цяпер ішлі да дому.

— Не магу, братка, ісьці,—прызнаўся Іван.

— Дык што-ж мы будзем рабіць?

— Дай ляжам, паляжым.

— Ну, давай.

І яны ляглі.

— Што-ж мы будзем так ляжаць?—кажа Міхась.—Давай клясьці лясьнічага!

Іван замарматаў нешта пад нос і... заснуў.

— Ужо сьпіш? Уставай, пойдзем.

— Не магу, братка.

— Садзіся мне на плечы, панясу катла.

Міхась стаў на кукішкі і падставіў сьпіну. Іван узяўся за плечы. Сталі падымацца. Міхась крактаў, пяўся, а потым паваліўся сьпіною на Івана, і ляжаць абодва. Яны зноў абняліся. Ім здавалася, што ня было і няма на сьвеце гэткіх сяброў, як яны.

Паляжалі трохі. Іван захроп, як пшаніцу прадаўшы.

— Сьпіць,—сказаў Міхась і ўстаў.

Яму хацелася сьпяваць. Міхась быў чалавек вясёлы. А яшчэ быў весялейшы, як хмель пачынаў туманіць яго лахматую галаву. Тады ён быў штукар на ўсе рукі.

— І гэ-э-э-эй ты, гарэ-э-э-элачка!— прабаваў Міхась выдумаць песьню пра гарэлку. Далей нічога ня мог прыдумаць і сьціх.

У лесе было ціха. Толькі рэха пакацілася! І далёка-далёка паняслося «гарэ-э-э-элачка» і прапала недзе за гарою ў Белых Крыніцах. Аж страшна стала Міхасю.

II

Не бяз прычыны страшна зрабілася Міхасю: былі яны якраз недалёка ад Кірылавай магілы.

От што чуў я ад людзей пра Кірылаву магілу.

У князя Р. быў слуга Кірыла. Князь любіў езьдзіць на паляваньне і заўсёды браў з сабою і Кірылу. Адзін раз кажа яму князь:

— От што, каханы, я паеду да пана абедаць, а ты садзіся вярхом на каня, і колькі лесу аб'едзеш на кані, пакуль я паабедаю, увесь той лес дарую табе, бо ты добры слуга.

Падзякаваў Кірыла князю, узяў самага лепшага каня, сеў і паехаў. Каб князь бачыў, колькі ён аб'едзе, узяў ён з сабою шаблю і рабіў ёю на хвоях лысінкі.

Як пабачыў князь, колькі Кірыла лесу аб'ехаў, аж за галаву ўзяўся.

— От, што, каханы,—кажа князь:— цяпер ты палезь на дуб, ды паглядзі адтуль, як многа ў цябе лесу.

Кірыла палез на самы верх.

Зьняў князь з плеч стрэльбу.

— Ну, мой каханы, закукуй цяпер, як зязюлька.

Кірыла закукаваў.

Бух!—выстраліў князь.

І скінуўся на зямлю бедны Кірыла з прабітаю навылет галавою.

Пад тым дубам яго і пахавалі. Месца тое і стала звацца Кірылаваю магілаю.

І цяпер яшчэ ў тым лесе відаць на хвоях лысіны. Заплылі яны смалою, і завуць іх Кірылавымі знакамі.

Расказвалі людзі, што ў поўнач каля магілы нехта плакаў, праклінаў панскую несправядлівасьць...

Страшна было тут уночы.

III

Многа расказаў чуў Міхась пра чарцей. Знаў ён, што п'яных часта водзяць па лесе чэрці. Знаў, што ад іх можна адхрысьціцца, і яму было і страшна і весела.

І ось Міхась, як яго хто падбіў, узяў і загукаў на ўвесь лес:

— Чэрці, трасца вашай галаве, сюды ідзеце!

Рэха паняслося па дарозе, пашло па кругламу балоту к Белым Крыніцам і сьціхла каля Кірылавай магілы.

Міхась стаяў і слухаў, як яно гудзела.

І зноў усё стала ціха.

Блішчасты месяц, як кружок залаты, стаяў ужо высака над лесам. Ціха было ў густым бары; закрыла ніз цемната. У Белых Крыніцах нудна пераклікаліся совы. Далёка-далёка, як з-пад зямлі, данасіўся сабачы брэх. І чуе Міхась: нешта загрукатала па дарозе. Прыслухаўся... Гук ня

сьціхаў і быў ужо бліжэй. Ужо можна распазнаць, што нехта едзе. Колы біліся аб карэньне і скрыпелі.

Міхась пасьмялеў.

Гук і скрып калёс зусім ужо блізка.

Міхась скінуў кажух, вывярнуў уверх шэрсьцю і накінуў на сябе. У шапку ўваткнуў дзьве палачкі паміж рожак і прытуліўся пад хвояй.

Іван спаў, як забіты.

Пад'ехаў воз.

На возе ляжалі мяхі з мукой, а на мяхох сядзеў селянін. Гэта быў Пятрусь Гвозд, той самы Пятрусь, што летась украў у Міхася з лесу тры восі. Пятрусь вяртаўся з млына; боязна азіраючыся па бакох, ён паганяў каня, каб хутчэй мінуць гэта страшнае месца.

## IV

— Стой!—крыкнуў Міхась, выскачыў з-пад хвоі і схапіў каня за вобруць.

Пятрусь так і абамлеў.

— Дык вось ён які чорт!—падумаў Міхась.—Што-ж тут рабіць?

«Чорт» стаяў і не даваў дарогі.

Пятрусь трохі апомніўся. Да яго вярнуўся язык і памяць.

— Уцякай з дарогі, бо камнем раздушу!

— Як?! ты мяне з дарогі гоніш?

— Уцякай, кажу, а то яшчэ і нюхаўку паб'ю!

— Ты мне?! Ды ты ведаеш хто я?

— Ну, хто-ж ты?

— Ага! Хто я? Папробуй выцяць!

Пятрусь ужо падняў пугу, але не асьмеліўся выцяць «чорта».

— Ну годзе! пашоў з дарогі!

— Не, не пайду!

— Чаго ты прывязаўся, як смала? Згінь, прапазді!

Але «чорт» ня гінуў.

Пакуль яны крычалі, конь пачуў волю і стаў памаленьку заварачвацца назад, шчыплючы траву. У сварцы Пятрусь зусім ня бачыў, што конь яго завярнуўся.

А Міхась як падскочыць да Пятруся ды як запішчыць! Ды так моцна, што аж Іван падняў галаву. А конь шчыпаў траву каля Івана. Як заварушыўся Іван—конь спудзіўся і паскакаў назад у млын.

— Га-га-га-га!.. зарагатаў Міхась (ён чуў, што чорт рагоча, падмануўшы чалавека). Пятрусь і ня думаў спыняць каня: скарэй-бы ад гэтага нячыстага месца!

Але як ён дзівіўся, калі йзноў прыехаў у млын.

А назаўтра Пятрусь Гвозд усім, як у звон званіў, што бачыў чорта каля Кірылавай магілы.

# ТРЫВОГА

## I

Ужо два тыдні, як над сялом павіс нейкі страх і трывога, чаканьне чагось страшнага і неадхільнага. А што паслужыла першаю прычынаю, дык гэта—вялікая суш. Як толькі пачалася вясна, ніводнага ня было дожджыку. Пасеянае збожжа ў палёх і агароды гібелі. На гэтым грунце й пашлі ўсялякія гутаркі. То тут, то там на вуліцы зьбіраліся мужчыны і жанкі і разьбіралі прычыны, чаму няма дажджу, тут-жа расказвалі розныя страшныя здарэньні апошніх дзён.

А нядаўна пастушкі бачылі такое дзіва, што і ў лысых падымаліся дыбам валасы: на полі сowалася ваўчыца, у якой была чалавечая галава. Апроч гэтага, у лесе, як казалі, туляліся катаржнікі, уцёкшыя з астрогу. Усё гэтае, узятае разам, і радзіла той страх і трывогу, што, як туман, віселі над сялом.

А на ўсё сяло найбольшым трусам быў Мікола Гляк. Такога палахлівага і баязьлівага чалавека, як ён, трудна знайсьці. Баіцца ён воўка, баіцца нябожчыкаў, разбойніка, чорта.

Хоць вы азалацеце яго—ніколі ня пойдзе ён адзін уночы праз лес. А калі, бывала, захопіць яго ў дарозе шэрая часіна, то каню—бяда! І ўжо яго конік сам ведае: чуць толькі пачне зьмяркацца, ён не чакае, пакуль Мікола будзе тузаць яго лейцамі і паддаваць ахвоты пугай, а сам, пырхнуўшы для сьмеласьці, выгінаў сваю худую шыю з куртатай грывай і борзда драбязіў таўсматымі ножкамі. А калі Мікалаю даводзілася ў такі час ісьці пяхотам, то ён так шпарка йшоў, што прыходзіў дадому ўвесь мокры. Ішоў ён раз вечарам. Да сяла было яшчэ вярсты тры. На небе ўжо пачалі ўсходзіць першыя зоркі. Раптам з-пад ялоўцавага куста вылецела птушачка. Мікола зьнячэўку стаў, і з яго грудзей, проціў яго волі, вылецеў жаласны і доўгі крык:

— А-а-а-й!

## II

Ня спалася ў гэту ноч Мікалаю. У хаце з ім быў адзін толькі Міхаська, яго сын, хлопчык гадкоў шасьці. Жонка яшчэ ўдзень пашла да хворай сястры. Пакуль сяло гаманіла, Мікола сяк-так трымаўся і барукаўся са страхам, не даваў яму надта вялікай аблады над сабою. Сон-жа, як на злосьць, ніяк не замыкаў яму вочы. Праў-

да, удзень Мікола даў храпака і выспаўся. «Трэба кінуць гэты паганы звычай спаць удзень», думаў ён і хаваў галаву пад коўдру, плюшчыў вочы, прабаваў нават храпці. Але, храпануўшы раз, ён спалохаўся свайго храпу і зараз-жа перастаў. Тымчасам сяло моўкла, ноч усё глыбей і цяжэй насядала на зямлю.

— Міхась! Міхаська!

— Га!

— Ты ўжо сьпіш, сынок?

— Сплю,—пачуўся з запечка голас Міхася.

— Можа-б ты, сынок, зьбегаў да цёткі ды паклікаў-бы матку? Скажы—тату нешта нядобра зрабілася.

— Ого! я баюся!

— Дурань ты! Чаго баяцца? Вось сказаў!—стаў бацька высьмейваць страхі сына, а сам увесь калоціцца ад страху.

— А як спаткаю ваўчыцу з чалавечаю галавой?—сказаў сын.

— Якую ваўчыцу? Што ты пляцеш? Сасьніў, ці што?

— Сасьніў! Ці-ж ты ня чуў хіба?

— Дзе? Што?—спытаў бацька апаўшым голасам, а сам пачуў, як уся скура як-бы стала сьцягацца, каб вылужыць яго цела.

А Міхаська стаў расказваць пра ваўчыцу з чалавечай галавой і расказаў гэта такім тонам, што сьмешна было сумлявацца ў праўдзе.

— Брэшуць!—чуць ня плачучы, сказаў бацька.

— Дальбог, татачка, праўда! Вось, тата, не дасі веры! Спытайся, у каго хочаш.

Але тут у Міколы і язык адняўся. Ён баяўся зірнуць у вакно, бо быў пэўны, што ў акне ўжо тырчыць страшная галава.

Памаўчалі.

— Міхаська!—зноў аклікнуў бацька сына,—паглядзі ты там на прымурачку мой капшук з тытуном і прынясі мне яго, сынок: нешта захацелася закурыць.

Гаворачы так, Мікола думаў залучыць да сябе сына і палажыць яго з сабою—усё-ж весялей, як чуеш каля сябе жывую душу.

— Дальбог-жа, татачка, ня ўстану! Зарэж мяне—не падымуся: я чуў—нешта шаўпатала ў качэргах!

— Цьфу, брыда!—вырвалася ў Міколы.

Цяпер ён калаціўся, як асінавы ліст, і мусіў шчаміць зубы, каб ня ляскалі. Але быў такі момант, што сіла шчамленьня

перарвалася, і зубы так застукалі, усё роўна як Марцін Паліваны прабаваў на вялікдзень моц яйца, зьбіраючыся гуляць у біткі.

А сыну здалося, што гэта нехта бразгае ў акяніцу. Ён падняў галаву і абпёрся на локці.

— Тата!—голасам, поўным перапалоху, аклікнуў цяпер сын бацьку,—нехта трасе акяніцу!

Ці з вялікага страху, ці ад гічаноў, што бацька еў на вячэру, толькі-ж у жываце ў яго як забурчыць! Як-бы хто ў трубу затрубіў!

— Ай!—нема загукаў на ўсю хату Мікалай, ды так страшна й дзіка, што сыну здалося, што ўжо бацьку душаць, і ён з свайго кутка як залякоча!

А бацьку чорт ведае што здалося.

— Ай, тата!

— Г-г-гу!

І такі справілі кірмаш, што хата трaслася.

Мікола ўсхапіўся з пасьцелі, як няпрытомны. Ён нічога ня помніў, звалок з ашостку жончыну спадніцу і накінуў яе на плечы. Бягучы да дзьвярэй, вырваў з коміна заткала і выскачыў на двор. Каля яго, уляпіўшыся за зрэбныя порткі, бег Міхаська. А на гэты час праходзіла тут

варта. Пачуўшы крык, вартаўнікі таксама перапалохаліся. Зірнуўшы туды, адкуль нёсься крык, убачылі агонь: Мікалаева суседка, Лэя, пякла булкі і вышла з лучынай у сені.

— Пажар!—загаманіла варта.

Адзін з вартаўнікоў кінуўся на званіцу і давай жарыць у званы. Абудзілася сяло, падняўся крык, гвалт. З усіх двароў забрахалі сабакі.

— Хто гарыць? хто гарыць?—пыталіся, бягучы, людзі.

Мікола Гляк высунуўся з двара на вуліцу з заткалам у руках і з жончынай спадніцай на плячох.

Убачыўшы Мікалая ў такой вопратцы і з заткалам у руках, цэлая чарада сялян адкінулася назад і з крыкам: «чорт! чорт!»—пусьцілася наўцёкі.

— Стойце, браткі! гэта-ж я!—загаласіў Мікалай і пабег за імі з заткалам, а за ім і Міхаська. Але на вуліцы ўжо нікога ня было. Ахамянуўшыся, Мікалай узяў за руку сына і сказаў:

— Сынок, хадзем да хаты! І маўчы, нікому нічога ані шэп!..

А назаўтра яшчэ большая трывога павісла над сялом...

# ТОЎСТАЕ ПАЛЕНА

## I

— Не! я яго такі жыцьця рашу. У катаргу пайду, а галаву яму скручу!

Злосна прашоўся Паўлюк па хаце і з сілаю шпурнуў на лаву рукавіцы.

Жонка, стоячы з вілкамі каля печы, так і застыла. У чыгунчыку пабегла зацірка, а яна ўсё стаіць, слухае, чаго крычыць Паўлюк і хто яго так угнявіў.

Паўлюк Трывай толькі што прыехаў з лесу. І трэба-ж было чэрцям нагнаць на гэты час аб'езчыка на камору! Знашоў адно паленца таўсьцейшае проці меры, і ён з-за таго паленца абярнуў увесь воз дроў!

— А каб на цябе ліха абярнулася, трасца тваёй матары, гад ты печаны! Каб табе мазгі зьвярнуліся!—ніяк ня мог супакоіцца Паўлюк.

— Гэта ўсё Сучынскі?—пытае жонка.

— А няўжо-ж хто. Ён!

— От гад! Праўдзівы сабака. Вельмі верны служака. Усё роўна пойдзеш к чортавай матары, басяк! Думаеш міласьць заслужыш у князя? А як-жа! Расчыняй губу!

Паўлюк тымчасам сьціх.

Сядзіць над міскай з гарачым квасам і думае, відаць, важную думку, бо ўжо заметна было, як хадзілі яго сківіцы: ня так проста, як звычайна, а нейк трохі наўкруг, як жорны.

І праўда—Паўлюк думаў. Думаў, як злавіць Сучынскага і паказаць яму гэта палена на яго ўласнай скуры.

II

Прашло ўжо з тыдзень часу, а злосьць Паўлюка на аб'езчыка Сучынскага ўсё не астывае. Дый як ёй астыць, скажэце? Пойдзе Паўлюк ранкам даваць каню сена, пападзецца пад ногі палена і лішні раз напомніць Паўлюку тое тоўстае палена, з-за якога яму Сучынскі зьвярнуў на каморы дровы. І дзе ён ні павернецца, то ўсюды так ці йначай натыкаецца на праклятае палена. Пойдзе к суседу, там якраз на дрывотні пілуюць палена. Зойдзе ў хату,—у хаце суседзкая жонка, як зумыслу, гаворыць:

— Ото-ж якое тоўстае палена! І ў печ ня ўправіш!

Выйдзе Паўлюк на вуліцу, там які-небудзь сабакар ганяецца з паленам за сабакамі.

Палена, палена і палена! Бадай вы пагарэлі! Як-бы на сьвеце больш і няма ні-

чога, апрача гэтага палена. А ляжа Паўлюк спаць, прад вачыма так і стаяць палены.

— Ну-ж, гад! Не дажджэ тваё ліха!— скрозь зубы цэдзіць Паўлюк і варочаецца на другі бок.

— Мамка!—крычыць дзесь у кутку малы хлопчык, сын Паўлюка:—я скачваюся; ці няма чаго палажыць збоку?

— Зьлезь, сынок, пашукай каля печы палена і падлажы пад сяньнічок, адзываецца з-пад барахла маці.

Паўлюк сярдзіта варушыцца на пасьцелі і стогне, як зьвязаны стары маркач, каторага стрыгуць. А хлопчык ужо шворыцца каля печы.

— Чорт іх ведае, якія тут палены!— бунтуецца хлопец:—усё нейкія так плашкі, каб дзе знайсьці крыху таўшчэйшае.

— Пашоў спаць! сну на цябе няма!— не вытрымоўвае Паўлюк і падымае галаву, а сын, узяўшы палена, шыбуе ў запек і грукае паленам на ўсю хату.

Паўлюк успамінае Сучынскага і ад злосьці скрыгіча зубамі.

— Што ты, Паўлюк, скрыгічаш?—пытае, лежачы збоку, жонка.

— Нешта, падла, зуб заныў,—лжэ Паўлюк, каб адчапіцца, і варочаецца ад жонкі ў другі бок.

— А ты вазьмі съцюдзёнай вады; там каля парога стаіць на палене,—радзіць Паўлюку жонка.

— Сьпі лепш!—сьцяўшы зубы, гаворыць Паўлюк.

Патрошку ў хаце ўсё заціхае, і салодкі сон усім замыкае вочы. Адны толькі насы зайгралі цяпер на ўсе галасы. Адзін нос тоненька высьвістваў:

— Э-ге! Э-ге!

Другі жаласна ныў, як малады каршун у гнязьдзе.

— Фю! Фю!

Нос самога Паўлюка йграў тоўста, з лёкатам і перабоямі, як бусел над маладымі бусьлянатамі. Так і відаць было, што гэтак можа йграць толькі гаспадарскі нос.

Паўлюк спаў, але і сплючы ня мог ён збавіцца ад праклятага палена. Прысьніўся яму сон. Здаецца, едзе ён з лесу, вязе дровы. Спатыкаецца Сучынскі, і Паўлюк, многа не гаворачы, падыходзіць да аб'езчыка і—трах яго па мордзе! Завязалася бойка. Пакаціліся яны абодва на зямлю, а аб'езчык, кідаючыся, наваліўся Паўлюку на ногі. Паўлюк хоча іх выслабаніць і ня можа: замест Сучынскага зрабіўся тоўсты кругляк. Паўлюк мардуецца, вырабляецца, спацеў увесь, робіць апо-

шняе натужаньне, моцна варушыць нагамі.

Тут—грук яму жонка ў плечы!

— Га? што!—усхапіўся Паўлюк.

— Чаго ты трапечашся? бяз мала галёнкі мне не перабіў!

— Добрая галёнка—чуць ног не павыкручваў.

III

Было яшчэ рана,—чэрці на кулачкі ня выходзілі, як прачнуўся Паўлюк і аслабаніўся ад «тоўстага кругляка». Сон яго ўжо разагнаўся, і як Паўлюк ня плюшчыў вочы, заснуць ужо ня мог.

— Што-ж? трэба ўставаць,—рашыў Паўлюк і падняўся.

Абуўшыся і апрануўшыся, пашоў ён у гумно. Праз поўгадзіны з току данасіўся мерны стук адзінокага цэпа. На таку ляжаў пасад жыта ў восем снапоў, палажаных па пары, каласы з каласамі. Паўлюк пачародна абіваў цэпам то адзін, то другі снапок і паволі, ды заложна, наступаў ён на снапы, зрэдка чуць падаючыся назад, каб спрытней было выбіць зярняткі, але, у вагуле, ён усё йшоў уперад, аж покі не даходзіў да апошняга снапка. Тады ўжо ён, зьлёгка стукаючы цэпам, адыходзіў назад, прыбіваў каласкі. Абабіўшы

адзін бок снапкоў, ставіў цэп, варочаў іх на другі бок ды зноў такім-жа парадкам калаціў іх. Акалаціўшы, разьвязваў, зьнімаў перавяслы, расьсьцілаў снапкі ў пласты, зноў біў, зноў варочаў, вытрасаў кулі, мяў салому, і так да канца, покі не канчаў усяго пасаду.

Малоціць Паўлюк, а думкі так і варушацца ў яго галаве. Думалася пра сон,— ніяк ён ня выходзіў з галавы, пра аб'езчыка Сучынскага, аб тым, як і дзе яго злавіць і хоць-бы ў смак паабіць гада. Забудзецца Паўлюк, думаючы аб Сучынскім, і так пачынае жарыць цэпам, што сноп падскаквае ўгару. Паўлюк у гэты момант думае аб тым, як ён біў-бы Сучынскага. Зьвязвае куль, і яму здаецца, што ён паваліў аб'езчыка і душыць яго. Паўлюк забываецца да таго, што перавясла трашчыць у яго руках і рвецца. Потым Паўлюка пачынае займаць думка, як залучыць аб'езчыка ў свае лапы.

Папільнаваць яго ў лесе? Дык чортжа яго ведае, калі ён будзе ехаць або ісьці, ды ў лесе яшчэ хто наткнецца, а пры людзях такія справы ня робяцца.

Падгаварыць хіба навабранцаў, каб аб'юшылі яго, як будуць ісьці на прызыў. Але для гэтага трэба ня менш гарца гарэлкі дый трудна зрабіць так, каб людзі

ня зналі яго намовы. Не! калі рабіць, дык трэба зрабіць гладка, так, каб і камар носа не падтачыў.

А як зрабіць?

І зноў завярцеліся Паўлюковыя мазгі, пашлі выдумліваць хітрыя сеці, у якіх павінен быў заблытацца Сучынскі.

А каб проста падпаліць гада?

Што-ж? падпаліць ня штука, але ці хваціць розуму і хітрасьці схаваць канцы ў воду? Ды што ў яго ёсьць? Згарыць будынак, дык будынак скарбовы, на руку будзе скарбу: страхоўку возьмуць і яшчэ падзякуюць, а самога зловяць—і прашчай крама з таварамі! Паўлюку ўжо страшна стала, як успомніў, як білі і засудзілі за падпал Трахіма Скарача. Не! і гэта не гадзіцца. І яшчэ многа спосабаў перадумаў Паўлюк, ды ніводзін не здавольваў яго.

## IV

Нічога ня прыдумаў Паўлюк за ўсю раніцу. І злосьць яго брала, што нічым не дапячэш Сучынскага. Але яму тут памог сусед, Сьцёпка Навой; памог зьнячэўку, і ў мысьлях ня маючы таго.

Гэта было ў панядзелак.

Прыходзіць да Паўлюка Сьцёпка пазычыць поўвасьміны. Затрымаўся трохі,

разгаварыліся. А Сьцёпка якраз быў у нядзельку на рынку, хадзіў з жонкай купляць лён.

От і расказвае Сьцёпка, як у хаце крамніка Хацкеля сяляне пабілі паліцэйскага стражніка. Пятрусь Камар з Яблонаўкі і Мікіта Трацяк з Малой Слабодкі зашлі да Хацкеля выпіць па чарцы... Ну, ці мала які можа быць у людзей інтарэс? Сядзяць сабе яны, выпіваюць. Уходзіць стражнік, садзіцца каля стала, за якім сядзелі Пятрусь з Мікітай,—прыляпіўся, як той клешч да сабачага вуха. Ня гнаць-жа чалавека вон ад стала. Наліваюць і яму чарку, бо ўсякая, лічы, вантроба прагне гарэлкі. І ў стражніка была гэта вантроба, і ён таксама быў ня промах нашчот гарэлкі, асабліва, калі гарэлка гэта нічога не каштуе.

Выпілі адну поўпляшку, выпілі другую, разьвязаліся языкі, зьявілася і рызыка.

— Ну, што-ж? — гаворыць Мікіта стражніку:—ты з намі піў, стаў цяпер і ты.

— А ты знаеш, з кім ты гаворыш?— пытае стражнік.

— Даволі зірнуць на тваю мардасіну, каб ведаць, якая ты штука,—адказвае Мікіта, падпёршы рукою левы бок.

Слова за слова, завязалася сварка, а потым і бойка. Стражнік хацеў хапіць шаблю, але Пятрусь, як клешчамі, сьціснуў яго за плечы.

— Нічога не паможа табе гэта трапло,—гаворыць Пятрусь, ды разам з Мікітай павалілі яго на зямлю і давай мясіць. Зьбілі на горкі яблык. А Мікіта яшчэ адрэзаў рамень ад шаблі, сказаўшы:

— Добра будзе вушкі паўстаўляць у лапці.

Паўлюк слухаў, не прапусьціўшы ніводнага слова.

— І суду ня будзе?!—спытаўся ён.

— Які суд? Чалавек ты! Пабіліся п'яныя, от і ўсё,—гаворыць сусед.

Выслухаўшы расказ суседа, Паўлюк павесялеў: яму прышла ў галаву мысьль, якую ён так доўга шукаў і ня мог знайсьці.

## V

Спосаб быў знойдзен.

Цяпер астаецца залучыць на кірмашы аб'езчыка, завясьці яго куды-небудзь да Хацкеля ці Каца, напаіць, і тады можна будзе парахавацца.

У першую нядзельку адлажыў Паўлюк поўрубель грошай на гарэлку, якую ён вып'е з Сучынскім, запрог коніка і ўжо

сабраўся ехаць. Неспакойна трохі было на сэрцы ў Паўлюка, дый злосьць яго стала праходзіць, і ён гатоў ужо быў плюнуць і на той воз дроў, што на каморы абярнуў яму аб'езчык, і на самога аб'езчыка. Але, як ён у той час выяжджаў са двара, жонка, выткнуўшыся з сяней, гаворыць да яго:

— Зайдзі, Паўлюк, у лясьніцтва і вазьмі асыгнату, бо скора ня будзе чым выпаліць у печы: скінулі-ж табе на каморы дровы.

Як шылам, парнулі Паўлюка гэтыя дровы.

— Але! гэта-ж я і забыўся, што дроў няма ні палена,—сказаў Паўлюк і ўзяўся за кішэню; абмацаў поўрубель, завязаны ў анучыну, той поўрубель, які назначаны быў споўніць такое важнае назначэньне. У другім вузельчыку ляжалі два злоты на крупы; саракоўка на тараны і селядцы; залатоўка на соль і газу; дзьве дзесяткі і чатыры грошы на вобмешку япручку і яшчэ некалькі медзякоў на тытун і запалкі.

А за што ўзяць асыгнату на дровы? Хіба за гэты поўрубель? Паўлюк на момант задумаўся, а потым сьцебануў пугаю каня і паехаў сярдзіты і недавольны. Зноў

ня было спакою на душы ў Паўлюка, зноў прад вачыма стала тоўстае палена, воз дроў, аб'езчык, камора.

— Хіба ты скрозь землю правалішся! Будзеш ты ў мяне помніць гэта палена: бокам яно табе вылезе,—гаварыў сам сабе Паўлюк, згортваючы руку ў кулак.

Невясёлыя думкі насіліся ў Паўлюковай галаве. І навокал было так нярадасна і няпрыветна, як у Паўлюка на сэрцы. Дзьмуў халодны вецер, зьмятаў з узгоркаў сьнег і агаляў пяшчаныя іх скаты. Дзе-ні-дзе ў полі па межах стаялі адзінокія грушы і сіротліва махалі сваймі голымі галінамі, пацёпваючыся, як пажылыя кабеты з холаду. Там і сям параскідаліся па полі каменьні, як сьвіньні, і маўчліва ляжалі і мерзьлі на марозе.

«Ім усё роўна, цяпло ці холад. Скаці іх на загон,—будуць ляжаць на загоне, нікому не пажаляцца на сваю долю», думаў Паўлюк, пазіраючы на гэтыя каменьні. Малады хвойнік рэзка выдзяляўся сваімі зялёнымі вярхамі на сьнежным полі і гультаежліва падымаў і апускаў свае непаваротлівыя лапы, усё роўна, як за каўнерам іх нешта кусала. Дарога, ідучы ў лес, станавілася гладкай і роўнай. Конік вясёла пырхаў і рэзва перабіраў сваймі тоўстымі нагамі. Аднатонны шум лесу за-

калыхваў памаленьку Паўлюковыя думкі і спакоіў яго душу. Паўлюк дастаў кісэт, падарунак жонкі, як яна яшчэ была дзяўчынай, люльку, выкрасіў агню і закурыў. Сіняваты дымок уздымаўся клубочкамі па сьвежым паветры і борзда прападаў, а разам з ім прападалі і трывожныя думкі Паўлюка. Цяпер Паўлюк быў спакоен, як чалавек, які цьвёрда, раз назаўсёды, пастанавіў сабе вядомую мэту.

А правучыць гада ня шкодзіць!—закончыў Паўлюк сваю раздуму аб Сучынскім і грозна пагнаў свайго коніка.

VI

Яшчэ за поўвярсты ад мястэчка Паўлюка сустрэла гандлярка з трыма пеўнямі пад пахай і запытала:

— Чалавек! можа маеш што на продаж?

Паўлюк толькі зірнуў, але нічога не сказаў. З усіх старон у мястэчка паўзьлі, як мурашкі, хурманкі і вязьлі розныя тавары. Усё места было ўжо ўстаўлена вазамі. Між гэтых вазоў прабіраўся Паўлюк да свайго зямляцтва. Там было ўжо многа мужчын і жонак з іх сяла. Залажыўшы ў кішэні рукі, з люлькаю ў зубох стаяў каля сваіх саней Антось Дубок, голасна гаварыў, рагатаў раскацістым сьмехам і

ўсякаму, хто з ім не згаджаўся, сьмела кідаў:

— А ну, давай заложымся!

Але ахвотнікаў ісьці з ім у заклад ня было, а некаторыя проста раілі Антосю Дубку залажыць за губу рэч ня надта самавітую.

— Во!—весела крычаў Антось:—збаяўся!—і выставіўшы жывот-ночвы, закідаў угару галаву і зноў рагатаў. Паўлюк спыніўся, выпраг каня, павесіў яму торбу з сечкай і азірнуўся. Народу было поўнае места, але настаяшчы торг яшчэ не пачынаўся. Увесь рынак можна было падзяліць на некалькі малых рынкаў. Кожная вёска занімала асобнае месца, куды і прывозіла свае тавары. У вадным месцы стаялі вазы з цэбрамі, ражкамі, поўвасьмінамі; у другім—з дровамі, дошкамі; у трэцім—з льном; у чацьвертым—са збожжам. Сярод рынку стаялі гаршчкі, міскі, збаны, лыжкі. Тут-жа дзе-небудзь раскладаў свой тавар рускі, які таргаваў абразкамі й кнігамі.

Людзкі гоман, піск сьвіней, парасят і ўсякай жывёлы зьліваўся ў адзін нястройны гул. Там і сям віднеліся сінія шапкі і чырвоныя шнуры.

Торг памалу пачынаў ажываць. Між вазоў шворыліся розныя купцы і пера-

купшчыкі. То там, то сям стаялі кучкі жыдоў і сялян. Адзін сівабароды жыд так заядла таргаваўся, так выкрыкваў і біў сябе кулаком у грудзі, як-бы яму зрабілі кроўную крыўду. Каля крам хадзілі некалькі жанок, шукаючы сваіх мужыкоў. То адна, то другая пыталася сваіх знаёмых.

— Ці ня бачылі майго Грыгора?

А Грыгор у гэты час сядзеў ужо каля бутэлькі і варочаў п'янымі вачыма.

У вадным месцы адно праразьлівае п'янае горла крычала:

— Ты мой наймілейшы прыяцель!

Другое, хрыпатае, лаялася апошнімі славамі, лезучы да першага цалавацца:

— Братка ты мой, халера ты!

Але ня гэта займала Паўлюка. Ён стаяў адзін і пільна прыглядаўся, ці ня згледзіцца дзе шапка з зялёным вярхом. Ужо трох лясьнікоў ён чуць быў ня прыняў за аб'езчыка, і кожны раз ёкала яго сэрца.

— Што-ж гэта ня відаць яго, смрода?—пытаў сам сябе Паўлюк.

— А! унь ён.

Паўлюк аж задрыжаў: у трох кроках ад яго стаяў Сучынскі.

Азіраючыся навокала, Паўлюк сьмела ідзе да аб'езчыка. Ён даўно ўжо выдумаў хітры плян, як залучыць свайго ворага ў

патайную краму шынка Шварца, у якім быў прыпынак усіх заядлых выпівак.

— Я хачу з панам пагаварыць,—сказаў Паўлюк, падышоўшы да аб'езчыка, пры гэтым ён пастараўся зрабіць, як можна, добрую і прыветную міну.

— Аб чым?—пытае аб'езчык.

— А вот...—Паўлюк трохі замяўся і боязна азірнуўся на ўсе бокі.

— Мо'-б мы з панам зашлі куды-небудзь?

— Куды-ж мы зойдзем?

— Ды зойдзем хоць да Шварца.

Аб'езчыкаў нос адразу зьнюхаў гарэлку.

Мужчыны пашлі,—Паўлюк уперадзе, а за ім Сучынскі.

Усе каморкі ў Шварца былі набіты народам; на падлозе валяліся коркі ад піўных бутэлек; пахла гарэлкаю і селядцамі.

Паўлюк выбраў цёмную каморку і аставіў аб'езчыка, а сам адлучыўся зрабіць заказ нашчот выпіўкі.

Покі Шварц шворыўся з выпіўкаю і закускаю, мужчыны гаварылі аб розных справах: аб тым, як цяпер усё стала дорага, якія пашлі парадкі, успаміналі даўнейшыя часы і г. д.

Тымчасам Шварц прынёс кварту, дзьве чаркі і два селядцы на талерцы. Паўлюк наліў чаркі.

— Будзьма здаровы!—сказаў Паўлюк, узяўшы чарку і матнуўшы да аб'езчыка галавою. П'ючы, Паўлюк зірнуў на аб'езчыка і сашчаміў пад сталом кулак.

Аб'езчык толькі што пасьпеў ткнуць у селядца відэльцам, як Паўлюк наліў яшчэ па чарцы.

— Хто закусвае посьле аднэй чаркі? Будзьма здаровы!

Выпілі яшчэ па чарцы.

Гарэлка сагрэла Паўлюка, і прыемная цеплата пашла па ўсім яго целе. А як бутэлька спаражнілася да палавіны, Паўлюку надта весела стала на душы. І людзі ў яго вачох зрабіліся другімі, і яго ўласнае жыцьцё стала лёгкім і прыемным.

— А ўсё-ж я табе паб'ю рыла! дальбог паб'ю,—гаварыў сам сабе Паўлюк і шчыкаў сам сябе за сьцягняк.

Выпілі яшчэ.

— Здаецца, ужо час біць яго,—разважаў далей Паўлюк.—Не! яшчэ вып'ю!

І зноў ён наліваў гарэлку.

— Ты ведаеш, прахвост, дзе ты ў мяне сядзіш? Во тут!—хацеў Паўлюк паказаць на сваё горла.

Аб'езчыку таксама было весела, і яны сабе сядзелі, цюкалі па чарцы, як найлепшыя сябры.

— Шварц! Шварц!—загукаў Паўлюк:— дай яшчэ поўкварты.—Паўлюку здавалася, што ён яшчэ ня надта сярдзіты.

— А ўсё такі паб'ю табе морду,—думаў Паўлюк, зрэдка паглядаючы на Сучынскага.

Яшчэ ня быў выпіты поўбутэлек, а Паўлюк ужо абнімаў аб'езчыка і гаварыў:

— Хоць ты сабака, лайдак і сьвіньня, і хоць я паб'ю такі твае рыла, але я люблю цябе!

Паўзучы ад Шварца чуць не на чатырох, Паўлюк марматаў:

— Я!.. Я скручу такі яму галаву!.. Не цяпер, дык у чацьвер.

---

## ЗЬМЕСТ.

1   25 кап.